**ЛЯШЧЫНСКАЯ ВОЛЬГА АЛЯКСЕЕЎНА** (н. 30.04.1946, в. Уселюб Навагрудскага р-на Гродз. вобл.), беларускі лінгвіст і педагог. Д-р філал. н. (2004), прафесар (2006). Закончыла Мінскі дзярж. пед. ін-т МДПІ імя А.М.Горкага па спецыяльнасці “Руская, беларуская мова і літаратура” (1968) і аспірантуру Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа АН БССР (1971). З 1971 г. працуе ў ГДУ імя Ф.Скарыны, прафесар кафедры беларускай мовы. Кіраўнік навуковых праектаў «Прыродазнаўчая тэрміналогія беларускай мовы» (1999–2000), «Тэарэтычнае і практычнае вывучэнне купалаўскай моўнай спадчыны» (2001–2005), “Фразеалагічная канцэптуалізацыя і катэгарызацыя свету беларусамі” (2011–2015), сукіраўнік тэмы «Беларуская лексікалогія і лексікаграфія на розных этапах развіцця лексіка-семантычнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы» (2006–2010). Кандыдацкая дысертацыя прысвечана вывучэнню суфіксальнага словаўтварэння атрыбутыўных назоўнікаў у беларускай мове, доктарская – мове твораў Янкі Купалы. Аўтар звыш 300 работ па розных галінах беларускага мовазнаўства і методыкі выкладання беларускай мовы. Спецыяліст у галіне фразеалогіі, дэрываталогіі, лексікаграфіі, тэрміназнаўства, анамастыкі, лінгвадыдактыкі.

*Літ.*: Ляшчынская В.А. (у суаўт.) Слоўнік мовы Янкі Купалы: у 8 т. Мн., 1997 – 2003; Ляшчынская В.А. Студэнту аб мове: прафесійная лексіка. Мн.,2003; Ляшчынская В.А. Слова ў паэзіі Янкі Купалы: манагр. Мн., 2004, Ляшчынская В.А., Шведава З.У. Слоўнік параўнанняў у мове мастацкіх твораў Янкі Купалы. Гомель, 2004; Ляшчынская В.А., Шведава З.У. Слоўнік фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы. Гомель, 2007; Ляшчынская В.А., Шведава З.У. Методыка выкладання беларускай мовы. Мн., 2007; Ляшчынская В.А. Фразеалагічныя адзінкі ў мове Янкі Купалы. Мн., 2008; Ляшчынская В.А. Сучасная беларуская мова: фразеалогія. Мн., 2010; Кулік Л.У., Ляшчынская В.А. Англа-беларускі слоўнік саматычных фразеалагізмаў; Беларуска-англійскі слоўнік саматычных фразеалагізмаў. Гомель, 2010; Ляшчынская В.А. Фразеалагічная эмацыянальная канцэптасфера беларусаў: манагр. Мн., 2012.

*Д.В.Дзятко*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ